*Ю.В.ЧАРНЯЎСКАЯ*

# МЕНТАЛЬНАСЦЬ І МЕНТАЛІТЭТ У ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ РЭАЛЬНАСЦІ

Апошнім часам паняцці «нацыянальны характар», «этнічны характар» становяцца менш папулярнымі, чым раней.

Па-першае, усе больш відавочна, што «характар» этнасу з'яўляецца не сумай асобасных рыс этнафораў, а грамадска абагульненым праяўленнем тыповых характарыстык, якія ў розных ступенях і спалучэннях прысутнічаюць у значнай колькасці членаў этнасу. Па-другое, спроба разглядаць пэўныя рысы як набытак этнічных злучэнняў беспадстаўная з прычыны рознага ўвасаблення адных і тых жа рыс у розных этнасаў і нават аднаго і таго ж этнасу ў розныя гістарычныя эпохі. Па-трэцяе, спробы пабудаваць патэрн нацыянальнага характару прыходзяць у сутыкненне з праблемай адзінай характаралагічнай парадыгмы, таму больш карэктна гаварыць пра перасячэнне розных або адносна ўзаемазвязаных сістэм.

У апошнія дзесяцігоддзі ў гуманітарыстыцы адбываецца замена размытага паняцця «характар» паняццямі «асоба» і «асобасная характарыстыка», якія вызначаюць асаблівасці паводзін і светапогляду. Таму найбольш адэкватнымі ў дачыненні да этнасу лічацца паняцці «ментальнасць» і «менталітэт». З першых крокаў вывучэння этнічных культур навукоўцы часта даследавалі гэту праблему менавіта з пункту гледжання ментальнасці, хаця ўжывалі для яе іншыя назвы («агульныя ўяўленні» – В.Вундт, «калектыўныя ўяўленні» – Э.Дзюрк-гейм, «тыповыя калектыўныя перажыванні» – Г.Шпет, нарэшце, «mentalité» – Л.Леві-Бруль). У паняцце ментальнасці ўкладаюцца і “суб’ектыўная культура” Г.Трыяндыса, і “рэпрэзентатыўная культура” Ф.Тэнбрука, і “цэнтральная зона культуры” Э.Шылза. Тэрмін “ментальнасць” не цалкам фармалізаваны, і ў гэтым – яго перавага, якая дазваляе выкарыстоўваць названы тэрмін у шырокім дыяпазоне без вылучэння феномена асобы пры страце разумення феномена грамадства і наадварот.

Значнай праблемай з'яўляецца менавіта размежаванне паняццяў «ментальнасць» і «менталітэт». Некаторыя даследчыкі, у прыватнасці П.С.Гурэвіч і А.І.Шульман, іх не размяжоўваць, а вызначаюць і ментальнасць, і менталітэт як сукупнасць “думак, вераванняў, навыкаў духу, якая стварае карціну свету і мацуе адзінства культурнай традыцыі або якой-небудзь супольнасці” [4, с. 271]. Але звычайна пад ментальнасцю разумеюць бессвядомае ядро самасвядомасці этнасу, а менталітэт вызначаюць як сацыяльна сканструяванае выяўленне ментальнасці. На наш погляд, успрыманне ментальнасці як бессвядомага ядра самасвядомасці спрэчнае, хутчэй можна гаварыць пра перадумову самасвядомасці этнасу, а ядро самасвядомасці – менталітэт.

Паводле Ж.Дзюбі, соцыум характарызуецца не толькі палітычнай сітуацыяй, вытворчасцю і іншымі аб’ектыўнымі параметрамі, але і ўяўленнямі, што выпрацоўваюць члены этнасу пра сябе, свет і сваю супольнасць (“карціна свету”). На аб’ектыўнае адлюстраванне гісторыі эпохі і лёсу этнасу накладваюцца суб’ектыўнае разуменне, бачанне свету этнафорамі. Але суб’ектыўнае разуменне не вычэрпвае ўсяго складу псіхікі этнасу. Існуе і больш глыбінны – бессвядомы пласт. Да патаемных глыбіняў псіхікі і ўзыходзіць ментальнасць. Гэтае сцвярджэнне з’яўляецца пунктам перасячэння розных даследаванняў. Таму развіццё ўяўленняў пра прыроду бессвядомага, спецыфіку яго механізмаў і функцый у рэгуляцыі паводзін чалавека і супольнасці з’яўляецца неабходнай умовай стварэння аб’ектыўнай карціны этнічнай рэчаіснасці.

Вобраз, які прыпадабняе свядомасць да вяршыні айсберга, адэкватна адлюстроўвае суадносіны ўсвядомленага і неўсвядомленага ўзроўняў псіхікі ў рэгуляцыі дзейнасці чалавека і соцыуму. Вось чаму даследаванні пазнання, асобы, міжгрупавых адносін, што ігнаруюць неўсвядомлены ўзровень, падаюцца аднабаковымі. Аналізуючы бессвядомае і яго функцыю ў дзейнасці чалавека, мы прыходзім да пазітыўнай характарыстыкі бессвядомага як узроўню псіхічнага адлюстравання, дзе суб’ект і свет уяўляюцца непадзельным цэлым. Аднак стварэнне такой характарыстыкі магчыма толькі ў выпадку крытычнага стаўлення да біялагізатарскай трактоўкі бессвядомага З. Фрэйдам.

Цікавай падаецца прапанова П.У.Сіманава выдзяляць Падсвядомасць (зместам якой з’яўляецца тое, што магчыма для ўсведамлення) і Звыш- або Надсвядомасць, дзейнасць якой не ўсведамляецца зусім: на суд свядомасці выносяцца толькі яе вынікі. Змест Звышсвядомасці заўжды “працуе” на задавальненне патрэбы, якая дамінуе ў іерархіі матываў асобы або

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

супольнасці [6, с. 60–69]. Тым самым на глыбінным узроўні можна патлумачыць існаванне тэалагічнай і этнаабароннай функцый у развіцці этнасу. А ў больш шырокім сэнсе можна гаварыць пра універсальны прынцып развіцця, пра прынцып узнікнення інавацыі ў філа- і этнагенезе, у творчасці, у гісторыі этнічнай і су- светнай культуры. Узнікненне новага мае на ўвазе наяўнасць чатырох кампанентаў: эвалюцыяніруючую папуляцыю; непрадказальную зменлівасць эвалюцыйнага матэрыялу; адбор; фіксацыю (спадкаемнасць у шырокім сэнсе) яго вынікаў [6, с. 66].

У культуры этнасу гэтым кампанентам адпавядаюць:

– вопыт суб'екта (асобы ці супольнасці), што ўключае прыўлашчаны ім як досвед сучаснікаў, так і досвед папярэдніх пакаленняў;

– звышсвядомасць, гэта значыць трансфармацыя і рэкамбінацыя энграм гэтага вопыту (так выяўляе сябе крэатыўная функцыя этнічнай культуры);

– свядомасць, што вылучае гіпотэзы шляхам лагічнага адбору, а потым шляхам праверкі (эксперыментальнай, вытворча- і грамадска-практычнай). Тут асабліва важна ўлічваць, што свядомасць абавязкова ўключае момант са- дзейнічання. "С-вядомасць – гэта веданне з кімьсці… Усвядоміць – гэта азначае набыць патэнцыяльную магчымасць навучыць, перадаць свае думкі іншаму" [6, с. 66]. Менавіта камунікатыўнасць ляжыць у аснове працэсаў інтэграцыі і дыферэнцыяцыі як найістотнейшых кантрапунктаў самасвядомасці этнасу (соцыуму). Акрамя таго, вынікам уздзеяння свядомасці і бессвядомага на ўзроўнях пад- і звышсвядомасці вызначаецца рэгуляцыя паводзін членаў этнасу. "Бессвядомае ўплывае на нашы ўчынкі, выказваецца праз нашы паводзіны, і праз гэтыя сляды і выявы мы вучымся пазнаваць свядома бессвядомае і законы, што кіруюць ім" [цыт. па: 7, с. 82];

– замацаванне вынікаў адбору не толькі ў індывідуальнай памяці, але і ў культурнай спадчыне (традыцыя). Больш за тое, гэта не толькі замацаванне, але і выбіральнасць як асаблівасць традыцыі.

Найістотнейшыя аспекты праяў бессвядомага ў дачыненні да культуры этнасу зводзяцца да наступных праблем:

– перадачы міжпакаленнага вопыту і функцыі гэтага вопыту ў сацыяльна-тыповых паводзінах асобы як члена той або іншай супольнасці,

– матывацыйнай дэтэрмінацыі паводзін асобы, што прыводзіць да змен супольнасці.

Грунтуючыся на іх аналізе, можна вылучыць адпаведныя тыпы бессвядомага: надасобасныя звышсвядомыя з'явы; неўсвядомленыя імператывы паводзін асобы. Звышсвядомыя з'явы ў нашым разуменні (тут мы салідарныя з А.Р.Асмолавым) – гэта засвоеныя суб'ектам узоры тыповага светаўспрымання, светаразумення, эпістэм, мадэлей паводзін, уплыў на якія не кантралюецца суб'ектам [1, с. 51–60]. Гэтыя ўзоры (напрыклад, этнічныя стэрэатыпы, якія не з'яўляюцца лагічна абгрунтаванымі), калі засвойваюцца праз перайманне і ідэнтыфікацыю, у многім вызначаюць сацыяльна-тыповыя асаблівасці паводзін, у праявах якіх суб'ект і група выступаюць як непарыўнае цэлае. Падобныя ўзоры, малазменныя ў часе, з'яўляюцца бессвядомай асновай існавання традыцыі. Такім чынам, юнгіянская канцэпцыя архетыпаў, што па- кладзена ў аснову ідэі ментальнасці, знаходзіць сваё абгрунтаванне.

Дзякуючы неўсвядомленым імператывам дзеяння (матывы і ўсталяванні) выяўляецца інаватыўнасць жыцця этнасу. Гэты тып праяў бессвядомага характарызуецца дынамізмам, які тлумачыцца іх прадвызначанасцю ідэалам (ідэальны інтравобраз і міф пра "залаты век", прынятыя a priori). Важнае значэнне для іх разумення маюць феномены эмацыянальнай інтэграцыі і афіліяцыі. Толькі суадносіны, якія спараджаюць сэнсаўтваральны матыў, і служаць асновай для эмацыянальнай ідэнтыфікацыі, могуць змяніць асабістыя сэнсы індывіда і групы. Але гэтыя змены адбываюцца вельмі павольна.

У падмурак даследавання ментальнасці кладзецца яе разуменне як прадмета вывучэння "гісторыі на скрыжаванні" [3, с. 41], што знаходзіцца ў полі дыялога паміж індывідуальным і калектыўным, неўсвядомленым і ўсведамляемым. Падаецца, што кропка апазіцыі "бессвядомае – усвядомленае" і ёсць кропка размежавання паняццяў "ментальнасць" і "менталітэт". Пад ментальнасцю этнасу тут і далей мы будзем разумець "этнічнае бессвядомае" (Дж. Дэвero) – частку бессвядомага сегмента псіхікі індывіда, агульную з іншымі членамі этнасу і рэпрэсіруемую ў адпаведнасці з патрабаваннямі культурных узораў. Ментальнасць звязана са светаадчуваннем, якое ўяўляе не толькі вобразны матэрыял карціны свету, але і дасвядомыя ацэньванне і мэтамеркаванне, якія ўключаюць і дзеянні суб'екта, абумоўленыя імі. Як сродак бачання свету ментальнасць пазаідэалагічная, паколькі непрарэфлектаваная і нявызначаная. Гэта глыбінны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзровень агульнаграмадскай псіхікі, на якім думка не адасоблена ад архетыпаў, эмоцый, "аўтаматычных" прыёмаў свядомасці. Ментальнасць належыць да глыбіннага "плана зместу", а не "плана выяўлення". Гэта "рэч у сабе" (у разуменні І. Канта). Дзеля таго, каб вылучыць ментальныя ўстаноўкі, даследчык павінен не зважаць на непасрэдныя заявы этнафораў, якія з'яўляюцца аб'ектам аналізу, а спрабаваць пранікнуць у патаемны пласт іх свядомасці, пра які яны часта не здагадваюцца і самі. У адрозненне ад ментальнасці менталітэт (які мы разумеем як вытворнае ад ментальнасці, узніклае ў працэсе спроб рацыяналізацыі апошняй) належыць да "плана змястоўнага выяўлення", бо грунтуецца не на светаўспрыманні, а на самасвядомасці.

Ж.Дзюбі меркаваў, што ментальнасць – гэта пададзеная ў руху сістэма вобразаў, уяўленняў, якія ляжаць у аснове карціны свету і вызначаюць паводзіны людзей [2, с. 52]. Аднак гэтая дэфініцыя ігнаруе адрозненне паміж ментальнасцю і менталітэтам. "Кароткі этналагічны слоўнік" вызначае менталітэт як устойлівы ізамарфізм, уласцівы культуры або групе культур. Такая трактоўка, адваротная разуменню Дзюбі, таксама зыходзіць з недакладнага размежавання гэтых паняццяў. "Сістэма ў руху", хутчэй, з'яўляецца характарыстыкай менталітэту, а фундаментальная ўстойлівасць у дачыненні да змен – ментальнасць (гэтая устойлівасць у многім тлумачыцца бессвядомым характарам ментальнасці).

Яшчэ ў першай трэці ХХ ст. М.Шэлер спрабаваў вылучыць асобныя універсальныя і па-рознаму зразумелыя ў культурах бессвядомыя катэгорыі, разумеючы пад імі парадак любові і парадак нянавісці. Мы б змякчылі дэтэрмінізм гэтага выказвання, вызначыўшы ментальны комплекс як выбіральнасць пераваг і антыпатый. Гэта блізка да гіпотэзы Ф. Граўса, які меркаваў, што ментальнасць вызначае мяжу паміж тым, што этнафор можа дапусціць як прымальнае для супольнасці і для асобы [3, с. 29]. Такім чынам, ментальнасць выяўляецца ў прадухіленасці індывіда да пэўных тыпаў рэакцый, меркаванняў, узораў паводзін.

Падаецца прадуктыўнай распрацоўка тэмы "цэнтральнай зоны" культуры (Э.Шылзам і С.Лур'е), якая разумеецца як этнічная ментальнасць і ўключае пэўныя этнічныя канстанты, такія як:

– уяўленне пра вобраз і крыніцу дабра, што ўключаюць "Мы-вобраз", а таксама "вобраз Іншага" (у асобе спрыяльна настроеных этнасаў);

– уяўленне пра крыніцу зла ("вобраз ворага");

– устойлівае і своеасаблівае для кожнай культуры ўяўленне пра сродак дзеяння, у якім дабро перамагае зло.

У такіх уяўленнях утрымліваецца доказ стабільнасці ментальных характарыстык, бо, не зважаючы на змены ў канкрэтным напаўненні канстант, іх агульныя характарыстыкі, узаемапрадухіленасць і ўяўленне пра сродак дзеяння застаюцца нязменнымі [5, с. 224]. Такім чынам, ужо на ўзроўні ментальнасці зараджаецца і захоўваецца традыцыя.

Звернем увагу яшчэ на адзін аспект, звязаны з меркаваннем пра некалькі ўзроўняў адаптацыі этнафораў да культуры. Так, пры зараджэнні і на ранніх этапах этнагенезу асабліва істотная тэлеалагічная функцыя ментальнасці, што палягае ў працы Звышсвядомасці па задавальненні патрэбы ў саўдзельнасці і раздзяленні, гэтая патрэба дае матыў і першасныя мадэлі дзеяння. Адпаведна заканамерныя вобразы "мы – яны" (апазіцыя "людзі – нелюдзі") і міфы, якія ўключаюць мадэлі паводзін "сваіх" і "чужынцаў". Амбітэндэнтнасць "мы" (інтэграцыя з "Мы" і адмежаванне ад "Яны") складае бессвядомае псіхалагічнае абгрунтаванне этнагенезу. Доказ бессвядомасці гэтага размежавання – у яго гамалагічнасці паводзінскім тэндэнцыям жывёл. На наш погляд, у гэты перыяд этнагенезу і пачынае фарміравацца ментальнасць. На другім этапе адбываецца стварэнне мадэляў этнічнага бачання. Тут этнічныя канстанты выконваюць абарончую функцыю: пры адрозненнях у светаўспрыманні этнафораў застаецца "сакральны парог", за якім адрозненні не дзейсныя. Апошні этап звязаны са спробай усведамлення этнафорамі сваіх ментальных характарыстык, са знаходжаннем прычын і заканамернасцей паводзін членаў этнасу, гэта значыць з вопытам рацыяналізацыі. Тады і ўзнікае менталітэт – сацыякультурнае ядро самасвядомасці супольнасці, якое дазваляе абагульнена ўспрымаць этнічную рэчаіснасць, ацэньваць яе і дзейнічаць у ёй у адпаведнасці з нормамі, каштоўнасцямі і паводзінскімі мадэлямі.

Пры спробе вылучэння перадумоў узнікнення менталітэту значнымі падаюцца наступныя:

– ментальнасць як агульны тонус даўгачасных формаў светаўспрымання і паводзін этнафораў, якія спараджаюць спалучэнне сродкаў і зместаў мыслення, што з'яўляюцца вызначальнымі для дадзенага этнасу;

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

– самавобраз народа як спроба ўсведамлення выяўленых рыс этнасу (канстантны інтравобраз); мэт накіраванняў (ідэальны інтравобраз); недахопаў, з якімі ён змагаецца (самакрытычны інтравобраз);

– маральныя каштоўнасці і стэрэатыпы. Перадумовы да стварэння як каштоўнасцей (бессвядомыя матывы і сэнсавыя ўсталяванні), так і стэрэатыпаў (бінарная апазіцыя "людзі – нелюдзі") узнікаюць ужо на ўзроўні ментальнасці. Але менавіта з узнікнення менталітэту як сацыякультурнага феномена яны сцвярджаюцца ў якасці этнічнага падмурка.

Істотнай з'яўляецца таксама праблема магчымасці змен менталітэту і ментальнасці. Мяркуем, што ментальнасць – практычна нязменны феномен з прычыны яе стварэння на базе архетыпаў, уздзеянне на якія праз свядомасць немагчымае (магчыма толькі індывідуацыя як спроба спалучыць гэтыя формы з фактамі свядомасці). З улікам сказанага хацелася б прааналізаваць тыпалогію ментальных працэсаў Школы Аналаў:

– хуткаплынныя і павярхоўныя (рэзананс, выкліканы пропаведдзю, скандал, які спарадзіў незвычайны твор мастацтва). На наш погляд, такія працэсы не звязаны ні з ментальнасцю, ні з менталітэтам: яны не прыводзяць да на- с-тупстваў не толькі для этнічнай, але і для групавой рэчаіснасці. Хутчэй, яны могуць уздзейнічаць на пэўнага індывіда. Але ў гэтым выпадку мы можам гаварыць толькі пра змены канкрэтнай індывідуальнай свядомасці;

– сярэднія па працягласці працэсы, якія закранаюць не толькі індывідаў, але і групы. Яны звязаны з палітычнымі, эканамічнымі, сацыякультурнымі зменамі. Тут мы маем справу з менталітэтам, а не з ментальнасцю: пра яе мы можам гаварыць толькі ў дачыненні да вялікіх супольнасцей, а менталітэтам валодаюць субкультурныя падраздзяленні. Побач з ментальнымі ўсталяваннямі, якія падзяляюць усе этнафоры, існуюць асаблівасці свядомасці сялянства і бюргераў, купцоў і інтэлігенцыі;

– "вязніцы доўгага часу" (тэрмін Ф. Брадэля), гэта значыць ментальныя структуры, якія супраціўляюцца зменам і якія ствараюць глыбінны пласт, што не мяняецца са зменай пакаленняў. Іх сукупнасць надае кожнай працяглай фазе гісторыі непаўторны каларыт;

– ментальны слой, звязаны з біялагічнымі ўласцівасцямі чалавека, які змяняецца толькі разам з эвалюцыяй саміх гэтых уласцівасцей [3, с. 19–20].

Апошні слой у нашым разуменні ментальнасці не мае да яе дачынення. Няма доказаў і на карысць змяняльнасці "вязніц доўгага часу". Калі ў ментальнай сістэме кожнае ўсталяванне "трымае" іншае, гэтую сістэму нельга лічыць адкрытай. У выпадку карэнных змен у сацыяльным быцці этнасу менталітэт супольнасці пры захаванні канстант яго ментальнасці можа мяняцца. Так, пераход ад язычніцтва да хрысціянства шмат у чым змяніў менталітэт народаў Візантыйскай і Заходне-Рымскай імперый, аднак адрозненні ў іх ментальнасці захаваліся і адыгралі сваю ролю ў разыходжанні менталітэтаў насельніцтва гэтых імперый. Прыметна тое, што этнічныя канстанты можна раскласці паводле прынцыпу бінарнай апазіцыі, дзе "вобраз дабра" і "вобраз зла" будуць выражаць полюсы, а "сродак барацьбы" будзе адыгрываць ролю медыятара.

Сукупнасць этнічных каштоўнасцей утварае іерархічную сістэму адносна дамінуючай каштоўнасці (ідэалу). Сама іерархія, хаця і ўспрымаецца не зусім усвядомлена, прадвызначана сацыякультурнымі рэаліямі, і ў сувязі з гэтым можна меркаваць, што менталітэт гістарычны і культуральны ў параўнанні з ментальнасцю. Ломка ідэалу цягне за сабой распадзенне або сур'ёзны зрух асноў светабудовы ва ўспрыманні этнафораў. Гэты сацыяльны крызіс аказвае разбуральнае ўздзеянне на менталітэт, што прыводзіць да дэвіянтных паводзін, сацыяльнай анаміі, а зрэдку – да разбурэння менталітэту і самой супольнасці. Аднак часцей этнас "не бачыць" падмены, бо абаронены ментальнымі падмуркамі, якія "падладжвае" пад змены рэчаіснасці. Важная роля тут належыць "інтэлектуалам", таму што яны карэкціруюць вобраз "мы", унутрыэтнічным групам, кожная з якіх, падзяляючы ментальнасць этнасу, валодае ўласным менталітэтам.

У той жа час трэба ўлічваць, што канкурэнцыя разнастайных унутрыэтнічных тыпаў менталітэту не адмяняе факта існавання адзінага менталітэту этнасу ў кожную эпоху яго быцця: адзінства менталітэту абумоўлена адзінствам культуры этнасу ў гісторыі і культуральным характарам менталітэту. Пры ўсіх адрозненнях абарончых механізмаў у іх маецца агульная рыса – накіраванасць абароны на захаванне "парадку ў істотным", гэта значыць у наяўнасці структураванай сістэмы арыентацый.

Пры даследаванні ментальнасці і менталітэту нельга не закрануць прынцыповага пытання пра іх узаемаўплыў. Наяўнасць ментальнасці з'яўляецца вызначальнай умовай для ўзнікнення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

менталітэту. Але паўстае пытанне і пра адваротнае ўздзеянне. На наш погляд, яно выказваецца дваяка. Першы тып палягае ў карэкцыі этнічнага бессвядомага з мэтай "утрымання" яго ў каштоўнасна-сэнсавым рэчышчы дадзенай супольнасці. Другі з'яўляецца рацыяналізацыяй этнафорамі ірацыянальных памкненняў, якія ўключаюцца ў каштоўнасную структуру этнічнай рэчаіснасці. Гэты тып часта ляжыць у аснове нацыянальных канфліктаў і звязаны са стварэннем ваяўнічых гетэрастэрэатыпаў і з абгрунтаваннем неабходнасці канфліктаў.

Ментальнасць вызначае сабой светаўспрыманне этнасу, а менталітэт – яго светаразуменне. У гэтым сэнсе ментальнасць з'яўляецца перадумовай самаўсведамлення этнасу і першаснай асновай яго самаідэнтыфікацыі, а менталітэт – ядром этнакультурнай самасвядомасці і этнічнай самаідэнтыфікацыі. Менавіта адзінства ментальнасці і менталітэту і складае "псіхакультурную цэласнасць этнасу".


1. *Асмолов А.Р.* На перекрестке путей к изучению психики человека // Бессознательное / Под ред. Ю.В.Макагоненко. – Новочеркасск: Сагуна, 1984.

2. *Дюби Ж.* Развитие исторических исследований во Франции после 1950 г. // Одиссей. Человек в истории: Альманах / Под ред. А.Я.Гуревича. – М.: Наука, 1991.

3. *История* ментальностей, историческая антропология. Зарубежные исследования в обзорах и рефератах / Редкол.: Е.ВГорюнов, Е.М.Михина и др. – М.: Рос. гос. гуманитарный ун-т, 1996.

4. *Культурология.* XX век: Словарь / Под ред. С.Я.Левита. – СПб.: Университетская книга, 1997.

5. *Лурье С.В.* Историческая этнология. – М.: Аспект-Пресс, 1998.

6. *Симонов П.В.* О двух разновидностях неосознаваемого психического: под- и сверхсознании // Бессознательное: Сб. / Под ред. Ю.В.Макагоненко – Новочеркасск: Сагуна, 1984.

7. *Цапкин В.Н.* Семиотический подход к проблеме бессознательного // Бессознательное: Сб. / Под ред. Ю.В. Макагоненко. – Новочеркасск: Сагуна, 1984.

8. *Чужое:* опыты преодоления: Очерки из истории культуры Средиземноморья / Ш.М.Шукуров, Ф.Артог, Г.И. Беневич и др. – М.: Алетейя, 1999.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ